# ВАСІЛЬ ФЁДАРАВІЧ ЧЫГІР



Доктар юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст рэспублікі Васіль Фёдаравіч Чыгір нарадзіўся і вырас у в. Лешня Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. У гады Вялікай Айчыннай вайны выпускнік сярэдняй школы В. Ф. Чыгір змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі спачатку ў партызанскім атрадзе, а затым ў Савецкай Арміі. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі. Пасля цяжкага ранення на фронце ён дэмабілізаваўся з арміі і некаторы час працаваў бухгалтарам калгаса, а затым (у кастрычніку 1945 г.) паступае ў Мінскі юрыдычны інстытут, па заканчэнні якога залічваецца ў аспірантуру. Паспяхова абараніўшы кандыдацкую дысертацыю, В. Ф. Чыгір працуе ў тым жа інстытуце выкладчыкам, а з 1956 г. — дацэнтам кафедры грамадзянскага права і працэсу Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1970 г. ён абараняе доктарскую дысертацыю ў галіне грамадзянскага права. З мая 1971 г. В. Ф. Чыгір узначальвае кафедру грамадзянскага права і кіруе ёю больш за 20 год. На працягу дзесяці гадоў (з кастрычніка 1973) ён быў дэканам юрыдычнага факультэта.

За 45 гадоў педагагічнай і навуковай дзейнасці В. Ф. Чыгір унёс вялікі ўклад у падрыхтоўку юрыдычных і навуковых кадраў. Ім апублікавана больш за 200 навуковых прац, сярод якіх вядомыя манаграфіі, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі. Кола навуковых інтарэсаў Васіля Фёдаравіча вельмі шырокае, але перш за ўсё ён вядомы як буйны спецыяліст у галіне жыллёвага права. В. Ф. Чыгір прыняў актыўны ўдзел у распрацоўцы новых Канстытуцыі, Грамадзянскага і Жыллёвага кодэксаў Рэспублікі Беларусь.

Пад кіраўніцтвам прафесара Чыгіра выкананы і абаронены шэраг кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па грамадзянскаму і жыллёваму праву.

Педагагічную і навуковую дзейнасць В. Ф. Чыгір паспяхова спалучае з грамадскай працай: шмат гадоў запар ён выбіраўся старшынёй прафсаюзнага камітэта універсітэта, аказвае навуковую і практычную дапамогу ў рашэнні складаных пытанняў Вярхоўнаму Суду, Вышэйшаму Гаспадарчаму Суду, Мінюсту, Пракуратуры і іншым органам.

Актыўная педагагічная, навуковая і грамадская дзейнасць В. Ф. Чыгіра адзначана высокімі ўрадавымі ўзнагародамі, у тым ліку ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровымі граматамі. Яму прысвоена высокае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь».

І сёння Васіль Федаравіч Чыгір поўны творчай моцы і энергіі. Ён бадзёры, мэтанакіраваны, настойлівы ў рашэнні пастаўленых задач. Пажадаем жа яму моцнага здароўя, новых поспехаў у педагагічнай, навуковай і грамадскай дзейнасці, шчаслівага і светлага асабістага жыцця.